© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

БАЦЬКАЎШЧЫНА

ВОРГАН БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНА ВЫЗВОЛЬНАЙ ДУМКІ

DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „BAĆKAUŠČYNA“ („VATERLAND“)
Herausgeber: Wladimir BORTNIK
Postadresse: Die Weissruthenische Zeitung „Baćkauščyna“ („Das Vaterland“), (13 b) München 19, Schliessfach 69.
Druck: „LOGOS“, Buchdruckerei u. Verl., G.m.b.H., München 8, Rosenheimer Str. 46 a
Цана паза Нямеччынай: ЗША — 15 цэнтаў, Канада — 15 ц., Ангельшчына — 1 шылінг, Францыя — 20 фр., Бэльгія — 5 фр., Аўстралія — 1 шылінг Аргентына — 2 пэзо. У іншых краінах раўнавартасьць 15 ам. цэнтаў. Цана лётніцкай поштай у заакіянскія краіны — 30 ам. цэнтаў. — Падвойныя нумары каштуюць падвойна.
Банкавае конто: Verlag „Baćkauščyna“, Konto Nr. 357-125, Bay. Hypotheken- u. Wechselbank, München.

ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ — ЦАНА 30 Н. ФЭН.

LE JOURNAL BIELORUSSIEN „LA PATRIE“ | DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „DAS VATERLAND“ | THE WHITERUTHENIAN NEWSPAPER “THE FATHERLAND„

№ 27 (257) | Нядзеля 3 ліпеня 1955 г. | ГОД ВЫДАНЬНЯ 9

Вялікі змагар за нацыянальную ідэю

Да трынаццатай гадавіны трагічнай сьмерці Янкі Купалы

У сваім бесьперапынным і бескампрамісовым змаганьні за вольнасьць і незалежнасьць, за людзкую годнасьць і нацыянальную поўнавартасьць, за свабодны развой духовых сілаў і ўсебаковы прагрэс, наагул у змаганьні за людзкія й нацыянальныя правы беларускі народ на сваім цярністым шляху злажыў нязьлічоную колькасьць дарагіх сабе ахвяраў. Усёзьнішчальны расейскі бальшавізм, напаткаўшы на сваім крывавым шляху нязломную мужнасьць беларускага народу й ягоную цьвёрдую волю да самастойнага жыцьця, пастанавіў вырваць зь яго душу, зламаць ягоную волю, здэправаваць яго маральна, каб зрабіць яго пакорным рабом, верным сваей дактрыне і сьлепа паслухмяным сваім дырэктывам. Каб дапяць гэтае праступнае мэты, трэба было ў першую чаргу зьнішчыць мозг народу — ягоную нацыянальную інтэлігенцыю, дзеячоў культуры, навукі, мастацтва, паэтаў і пісьменьнікаў, а свабодную думку народу, культываваную й разьвіваную гэтымі дзеячамі, закуць у ланцугі бяздушнай камуністычнай дактрыны.

Гэтак адбывалася саветызацыя Беларусі й беларускага народу.

Калі мы перагледзім гісторыю беларускага народу за апошніх 35 год, калі замацавалася на Беларусі савецкая ўлада, дык заўважым, што волялюбны беларускі народ ніколі не пагаджаўся з накінутай яму няволяй, супраць яе змагаўся рознымі спосабамі, усьцяж імкнуўся да вызваленьня і гэтыя свае імкненьні акупі, вялізарнымі ахвярамі. Спасярод сотняў і тысячаў выдатных Беларусаў, якія творчымі ідэямі, шырылі асьвету, працавалі над павышэньнем эканамічнае ўзроўні краіны, імкнуліся да прагрэсу й ўсебаковага матарыяльнага й духовага разьвіцьця народу, спасярод усіх гэтых народных дзеячоў і правадыроў толькі адзінкі дажылі да нашых дзён або памерлі натуральнай сьмерцяй. Усе-ж іншыя былі расстрэленыя, увязьненыя, высланыя ў лягеры прымусовае працы, тым ці іншым спосабам бязьлітасна зьнішчаныя або, як гэта называецца ў афіцыяльнай савецкай тэрміналёгіі, «зьліквідаваныя». Усе яны сталіся бязьвіннымі й трагічнымі ахвярамі за шчасьце й долю свайго народу.

Спасярод усіх іх, ведамых і бязіменных, выдатных і радавых змагароў, найвялікшай і найтрагічнейшай ахвярай, зложанай на аўтар Бацькаўшчыны, быў бясспрэчна найвялікшы беларускі паэта й заснавальнік новай беларускай нацыянальнай літаратуры, агульна вызнаны духовы правадыр народу й прарок беларускага нацыянальнага адраджэньня, Янка Купала.

Ужо ў пачатках паўстаньня бальшавізму і першых спробаў устанаўленьня ягонае ўлады ў Беларусі Купала заняў да яго бескампрамісова варожае становішча, ацэньваючы яго, як новую форму расейскага нявольніцтва. Астаючыся верным свайму народу й заклікаючы яго да незалежнага й поўнавартаснага нацыянальнага жыцьця, да «вызваленьня з пут», «строіць шчасьце, каб пут ня строіў больш сусед», Купала стаўся найбольш яркім запярэчаньнем бальшавіцкае дактрыны, а ягоная творчасьць найбольш магутнай ідэйнай сілай, якая гартавала волю народу «нядацца ў гэты грозны час прапасьці» і астацца самым сабой. Такім быў Купала аж да 1929 году, калі існавалі яшчэ некаторыя, хоць і вельмі абмежаваныя, магчымасьці свабоднае творчасьці.

Калі-ж у 1929-30 гадох наступіла першая хваля адкрытага нішчэньня бальшавікамі нацыянальных вартасьцяў беларускага народу, калі змаганьне зь беларушчынай перабрала ў свае крывавыя рукі ГПУ і пачало садзіць за краты цьвет беларускае інтэлігенцыі, калі заводзіцца прымусовы калгасны прыгон і пасягаецца на самую аснову нацыі — сялянства, калі вымагаецца ад вядучых дзеячоў беларускае культуры «перабудавацца» і стаць на службу акупанту, Купала праявіў нязвычайную мужнасьць і запратэставаў супраць нячуванага гвалту. Ён у 1930 годзе, у знак пратэсту супраць духовага й фізычнага зьдзеку над народам і самым сабой, спосабам гаракіры пасягае на собскае жыцьцё. Будучы адратаваным і пакінутым на нейкі час самому сабе, ён прадаўжае свой пратэст тым, што на працягу пару год зусім нічога ня піша.

Пазьней, з мамэнтам поўнага завайстрэньня духовага й фізычнага тэрору, Купала быў змушаны аддаць і сваю дань крэмлёўскаму молаху. І ён, як і многія іншыя, што ўцалелі перад фізычным зьнішчэньнем, але былі зламаныя тэрорам маральным, пачаў сьпяваць хвалебныя зьненавіджанаму бальшавіцкаму рэжыму. Але ўсё тое, што ім напісанае ад часу першае спробы самагубства ў 1930 годзе аж да пазьнейшай самагубнай сьмерці ў 1942 годзе, мізэрнае колькасна, адчэпнае й бязвартаснае з мастацкага гледзішча. Гэта ўсё на столькі няшчырае й чужое, што ня можа быць пастаўленае побач зь ягонымі дасюлешнімі творамі, палымяна ідэйнымі і высокімі з боку мастацкага, і ня можа ў ніякім выпадку служыць характарыстыкай Купалы, як паэты й грамадзяніна. Як правільна выразіўся адзін з эміграцыйных крытыкаў, Р. Склют, гэта ўжо быў «Купала — нявольнік і Купала — не паэта, Купала — узапраўды «жывы нябожчык», рукою якога, як чужою, чужая-ж рука вадзіла па паперы, аж пакуль свая собская рука ня вызваліла з глуму ў другім, удалым замаху 1942 году». У гэтым бо 1942 годзе, 28 чэрвеня, Купала, ня могучы далей пераносіць зьдзеку, канчае сваё жыцьцё самагубствам, акупліваючы гэтым вымушаныя радкі сваіх твораў у чэсьць савецкага ладу й рэжыму.

Але ня толькі ў самагубнай сьмерці і ў вымушаным услаўляньні найбольш ім зьненавіджанага заключаецца трагізм лёсу Янкі Купалы. Найвялікшым і найбольш балючым трагізмам для сьветлай памяці вялікага паэты й змагара, гэтак і для ўсяго народу, сталася тое, што бальшавікі пастараліся нахабна прысвоіць Купалу, як ідэйна свайго. Купала быў вялікі і за папулярны ў народзе, каб ягонае імя й ягоную творчасьць цалкам вымазаць зь гісторыі, як гэта зрабілі зь дзесяткамі й сотнямі іншых выдатных Беларусаў. Таму аставаўся адзіны магчымы ў бальшавіцкай практыцы спосаб: схвальшаваць ягоную творчасьць.

Яшчэ пры жыцьці паэты партыйная крытыка, хвальшыва камэнтуючы ягоныя творы, пачала дашукваццa ў іх таго, аб чым ніколі ня сьнілася навет самому аўтару. Высокія нацыянальна-вызвольныя ідэі Купалы, чужыя й варожыя бальшавізму, былі гэтай крытыкай насьветленыя, як ідэі блізкія камуністычнай дактрыне, зь ёю сугучныя або яе папярэджваючыя. Тыя-ж вымушаныя й артыстычна бязвартасныя хваласьпевы бальшавіцкаму рэжыму, якія паявіліся ў пэрыяд найжахлівейшага тэрору часоў яжоўшчыны, былі гэтай-жа крытыкай груба тэндэнцыйна прадстаўленыя, як ідэйнае й мастацкае завяршэньне і ўкаранаваньне ўсяе Купалавае творчасьці.

Але аставалася вялікая колькасьць Купалавых твораў, і то з мастацкага боку найлепшых, у якіх антыбальшавіцкія акцэнты былі на столькі выразныя й бясспрэчныя, што ніякая апэрацыя не магла ўжо іх паставіць на службу бальшавізму. Аставаўся тады адзіны, таксама шырака практыкаваны бальшавікамі, спосаб: вымазаць усе гэтыя творы з Купалавае літаратурнае спадчыны, як-бы іх зусім ня было. Аб іх навет забаронена сяньня ўспамінаць ні благім, ні добрым словам.

Гэтакі лёс спаткаў такія выдатныя творы Купалы, як «Паўстань з народу нашага...», «Перад будучыняй», «Царскія дары»; у гэтым апошнім пад расейскімі царамі выстаўляе Купала Сталіна і ягонае паняволеньне нерасейскіх народаў. Гэткі-ж самы лёс падзяліла і вялікая сатырычная п'еса Купалы «Тутэйшыя», у якой аўтар, прадстаўляючы розных акупантаў Беларусі ў 1918-20 гадох, у найгоршым сьвятле выставіў акупантаў бальшавіцкіх. Навет многія творы напісаныя перад першай сусьветнай вайной, у якіх не магло быць канкрэтных алюзіяў пад адрасам бальшавізму, бо аб ім нікому яшчэ тады й ня сьнілася, сяньня выкінутыя з Купалавае літаратурнае спадчыны, як нацыяналістычныя й супрацьрасейскія, супярэчныя зь цяперашняй русыфікатарскай палітыкай бальшавізму. Гэтак аказаўся «ачышчаным» ад «нацыяналістычнага буржуазнага элемэнту» сьвежа выдадзены ў Менску шасьцітамовы збор твораў Янкі Купалы, у якім, побач зь іншымі дарэвалюцыйнымі й пасьлярэвалюцыйнымі «гэрэтычнымі» вершамі, не знайшлося месца для напісанага ў 1908 годзе верша «Перад вісельняй», у якім Купала войстра

(Заканчэньне на 2-ой бачыне)

ЦАРСКІЯ ДАРЫ

Цар грозны, маскоўскі — вясёлы,
Шчасьлівы з пабедаў вялікіх —
У госьці і зь местаў і сёлаў
Нявольнікаў верных паклікаў.

Пад водгульле трубаў, літаўраў,
Пад рогат упасьвенай дворні,
Падносіць падданым ён дары —
Нявольнікі прыймуць пакорне:

Дару я табе, Украінцу,
Украіны капальні і стэпы, —
За гэта вуголь і пшаніцу
Ты звозіш мне ў сьвірны і склепы.

У Польшчы ты, польскі народзе,
Жыві сабе й думай аб славе, —
Мне толькі хай ткуць ткачы ў Лодзі;
Чуў — пекныя полькі ў Варшаве.

Хай Латвію возьмуць Латвійцы
І рыбную ў Балтыцы лоўлю, —
Адно я да іхняй зямліцы
Баронаў дадам на гадоўлю.

Ты цешся, Грузіне, краінай,
Тамарай грузінскаю слаўнай, —
Мне выдзяліш толькі часьціну,
Дзе пыхкаюць нафтай фантаны.

Свой Крым, а зь ім ханаў і мулаў
Бяры сабе, крымскі Татарын, —
Мне-ж мора пакінеш агулам
І ўсе санаторыі дарам.

Ты, мой туркестанскі субрату,
Ідзі ў Туркестан разжывацца, —
Ўзамен я каракул і вату
З тваіх пазьбіраю плянтацый.

Табе, Сібірак, без граніцаў
Сібір аддаю, мо' што высьпіш, —
Але мне да ўласнай скарбніцы
Сібірскае золата ссыпеш.

А ты, Беларусе нямрушчы,
Вазьмі Беларусь на ўспамінак, —
Твае-ж прыдадуцца мне пушчы
Мой царскі вялічыць будынак.

І права даю для ўсіх разам
Пладзіцца, як маку зярняты, —
За што мне за першым наказам
Дасьцё ўсе сыноў у салдаты.

Так грозны маскоўскі цар шчыра
Дзяліў між нявольнікаў дары,
Пад гукі прыдворных упыраў,
Пад водгульле трубаў, літаўраў.

1926.

Янка Купала

Паўстань з народу нашага...

Паўстань з народу нашага, Прарок,
Праяваў бураломных варажбіт,
І мудрым словам скінь з народу ўрок,
Якім быў век праз ворага спавіт.

Зьбяры ў вадну ўсю Беларусь сям'ю,
Вазьмі зь яе прысягу і зарок,
Што не прадасьць сябе, сваю зямлю...
Зьняць путы Бацькаўшчыне ўстань,
Прарок...

✳

Паўстань з народу нашага, Пясьняр,
Былых і будучых вякоў баян,
І ў бурны кліч, як буры ўдар,
Зь віхрамі загудзі пад звон кайдан!

Гудзі па Беларусі з краю ў край,
У сэрцах сьпячых распалі пажар,
Пад курганамі пярунам зайграй,
Збудзіць нябожчыкаў паўстань, Пясьняр...

✳

Паўстань з народу нашага, Ваяк,
І волатам на вогненым кані
Народ аграблены — бы з торб жабрак —
За Бацькаўшчыну павядзі ў вагні!

Да хвалы шлях айчыне пакажы.
Зьмяці з палёў яе чужых бадзяк,
На стражы стань гранічнае мяжы...
Свой край заваяваць паўстань, Ваяк!

✳

Паўстань з народу нашага, Ўладар,
Адбудаваць свой збураны пасад,
Бо твой народ забыў, хто гаспадар
І хто яго абдзёр з каронных шат.

На Ўладара жджэ Беларусь даўно,
І жджэ цябе ўладарства Божы дар,
Вялікае, магутнае яно...
Пад беларускі сьцяг прыдзі, Ўладар!

28. 8. 1919

Янка Купала

ЗЬМЕНА АДРАСУ РЭДАКЦЫІ Й АДМІНІСТРАЦЫІ

Усю паштовую карэспандэнцыю для Рэдакцыі й Адміністрацыі, а так-жа для Выдавецтва «Бацькаўшчыны» ў далейшым просім кіраваць выключна на наступны адрас:
Die Weissruthenische Zeitung „Baćkauščyna“ („Das Vaterland“)
(13 b) München 19, Schliessfach 69

✳

УДАКЛАДНЕНЫ АДРАС БАНКАВАГА КОНТА «БАЦЬКАЎШЧЫНЫ»

Адміністрацыя й Выдавецтва «Бацькаўшчыны» ўдакладнілі сваё банкаўскае конто, якое ў будучыні, пры перасыланьні грошаў, трэба выпісваць наступна:
Verlag „Baćkauščyna“, Konto Nr. 357-125, Bay. Hypotheken- u. Wechselbank, München.

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

У паняволенай Беларусі

У беларускіх савецкіх газэтах вядзецца спэцыяльны аддзел пад загалоўкам «Лісты ў рэдакцыю». Пераважна гэта бываюць скаргі «ў рэдакцыю», якімі перапоўнены савецкія газэты і якія даволі выразна адлюстроўваюць цяжкія праблемы штодзённага быту савецкага насельніцтва. Цяпер, калі бальшавікі пачалі актыўную акцыю закліку «за возвращчэніе на родзіну», — у край дабрабыту, волі і дэмакрацыі — весткі аб жыцьці пад бальшавіцкай акупацыяй на Беларусі набіраюць для нас асаблівага значэньня. Падаем тут колькі зь іх, узятых зь беларускіх савецкіх газэт.

ЗАВОД БЯЗ СЫРАВІНЫ

Лідзкі завод мэтальшырпатрэбу на працягу цэлага першага кварталу адчуваў войструю патрэбу сыравіны. Для выкананьня сакавіковага, а таксама квартальнага заданьня не ставала 5 тон алюмінію. З просьбай забясьпечыць завод сыравінай мы ня раз зьвярталіся ў трэст, аднак просьба засталася бяз увагі. З гэтым-жа пытаньнем я зьвярнуўся да заступніка міністра мясцовай і паліўнай прамысловасьці БССР, тав. Дружалоўскага, які забавязаў кіраўніка Маладэчанскае мясцовае і паліўнае прамысловасьці тав. Лукашэвіча выдаць 5 тон алюмінію... Аднак тав. Лукашэвіч катэгарычна адмовіўся выдаць алюміні. Аб гэтым было паведамлена своечасова ў міністэрства, аднак ніякіх захадаў для забесьпячэньня прадпрыемства сыравінай ня было зроблена.

Яшчэ горш стаяла справа з сыравінай ў красавіку. Спачатку месяца дзеля нястачы сыравіны завод быў спынены.

Р. Федасеенка, дырэктар Лідзкага заводу мэтальшырпатрэбу.

(Паводля «Советской Белорусии» з 1. 6. 55)

Ня дзіва, пасьля гэтага, што на Беларусі трэба стаяць у доўгай чарзе па каструлю, а пасьля купляць яе ў спэкулянта. Гэта значыць — пяршынство цяжкай індустрыі...

ДЗЕ ДАСТАЦЬ ПРОВАДУ?

Электрыфікацыя Даўгінаўскай сярэдняй школы Крывіцкага раёну — справа амаль разьвязаная. Ёсьць у нас дамоўленасьць з саўгасам «Даўгінава», што знаходзіцца кілямэтар ад школы, аб далучэньні да саўгаснае электрастанцыі. Ёсьць стаўбы для пракладу электралініі. Мае школа й нутраную праводку. Не стае голага проваду даўжынёй у 2,2 кілямэтра для вонкавае лініі. І вось якраз гэтае пытаньне і аказалася «неразьвязальным».

З гэтае прычыны школа зьвярталася ў Маладэчанскую кантору «Сельэлектрабуд», у Міністэрства гарадзкога і сельскага будаўніцтва БССР і Міністэрства асьветы БССР. Аднак просьба засталася незадаволенай.

Варта дадаць, што працу складаньня й мантажу электрасеткі мы думаем праводзіць самі. Гэта дало-б вучням шмат працоўных навыкаў.

К. Шкляеў,
дырэктар Даўгінаўскае сярэдняе школы.

(Паводля «Советской Белорусии» з 1. 6. 55)

Апошнімі часамі на Беларусі прэтэкст «працоўных навыкаў» зьяўляецца самым пашыраным апраўданьнем шырокага выкарыстоўваньня беларускіх дзяцей часам на вельмі цяжкіх дзяржаўных працах, каб хоць часткова закрыць гэтым вялікую люку нястачы працоўных рук на Беларусі, у выніку масавых вывазаў на так званую «цаліну».

ПО КІРПІЧІКАМ І ПО КАМУШКАМ...

Барысаўская станцыя. Кажны год яе ўсё ўдасканальваюць. Пэроны ўжо ўпарадкаваныя. Цяпер рамантуюць будынак станцыі...

Аднак дасюль яшчэ не заасфальтованы пляц пры станцыі і не наладжаны спуск дажджавое й талае вады. Штогоду ўвесну і ўвосень, а таксама дажджлівымі летнімі днямі на пляцы пры станцыі стаіць столькі вады, што пасажыры зь цяжкасьцяй прабіраюцца ў будынак станцыі й на пэрон. Кіравецтва станцыі ў гэткіх выпадках наладжвае часовыя мосьцікі з дошчак, пакладзеных на цэглы.

Гутарка аб наладжаньні дажджавое каналізацыі вядзецца ўжо тры гады. Шмат разоў прыяжджалі сюды розныя дарожныя начальнікі, аднак далей за абяцанкі справа не пайшла...

Л. Брыгневіч,
ст. інжынэр Барысаўскага гаркомхозу.

Паводля «Сов. Бел.» з 1. 6. 55).

ЧАМУ Ў НАС НЯМА ВАДЫ

Жыхары работніцкага пасёлку трэсту № 2 Міністэрства гарадзкога й сельскага будаўніцтва БССР, які размешчаны ў Менску на вуліцы М. Горкага, карысталіся вадой з двух вадаразборных калёнак, што ўвесну 1954 г. выйшлі з ужытку.

З прыходам халадоў трэст № 2 пачаў працу над зьменай магістралі. І вось больш за тысячу жыхароў пасёлку на доўгі час засталіся без вады.

Сваё абяцаньне забясьпечыць пасёлак вадой праз тры тыдні кіраўнікі трэсту ня выканалі. Мінула зіма, прыйшла вясна, а працы ўсё яшчэ ў пачатковым стане.

С. Квінт

(«Саветская Белоруссия» з 26. 5. 55)

Вялікі змагар за нацыянальную ідэю

(Заканчэньне зь 1-ай бачыны)

кляйміў катаў рэвалюцыі 1905 году, называючы іх «прыблудамі з над Нявы крывавай». Відаць маскоўскія каты другое рэвалюцыі, лютаўскай рэвалюцыі 1917 году, спалохаліся, што чытач можа лёгка іх утажсамліваць з тымі-ж «прыблудамі з над Нявы крывавай» з 1905 году. Не знайшлося тутка месца і для шырака ведамага напісанага перад першай сусьветнай вайной верша «Ворагам беларушчыны», у якім Купала войстра запратэставаў супраць русыфікатарскіх і палянізатарскіх пасяганьняў на беларускую мову. Відаць, сучасныя русыфікатары беларускае мовы пабачылі ў гэтым вершы суровы асуд сваей собскай русыфікатарскай практыкі. Ды ня месца тут пералічаць усе дарэвалюцыйныя й пасьлярэвалюцыйныя творы Купалы, на якія расьцягнулася сяньня забарона бальшавіцкае цэнзуры. Ужо і ўспомненага дастаткова хопіць, каб пераканацца, што ўся Купалава творчасьць мусіла быць прасеяная праз густое сіта бальшавіцкае цэнзуры і прапушчаная праз жорны партыйнае крытыкі, каб можна было яе сяк-так, груба хвальшуючы й перакручваючы, падцягнуць пад паняцьце бальшавіцкай і прабальшавіцкай творчасьці.

Дык дзе-ж аб'ектыўныя падставы гаварыць сяньня аб Купале, як аб «натхнёным песьняру сацыялістычнага будаўніцтва» і «перамогшага сацыялізму»? Хто даў права бальшавіцкім акупантам прысабечваць вялікую й дарагую для нашага народу Купалаву спадчыну? У кажным выпадку сам Купала права гэтага ня даў.

Купала для нас астаўся тым, кім ён быў у запраўднасьці. Спасярод усіх іншых майстроў беларускага мастацкага слова і волатаў нацыянальнага духа роля ягоная, як заснавальніка новай беларускай літаратуры, найвялікшая, а як ідэялёга беларускага нацыянальнага адраджэньня — выключная. Што-ж датычыцца ягонай ролі ў будучыні, дык можна яе вызначыць словамі др. Ст. Станкевіча, які ў сваім уступным артыкуле да эміграцыйнага выданьня выбранай паэзіі Янкі Купалы «Спадчына» пісаў: «Сяньня беларускі народ зьнемагаецца пад цяжарам найжахлівейшага маральнага й фізычнага нявольніцтва. Бязьлітасна нішчацца й маральна дэправуюцца ягоныя нацыянальныя таленты. Але пасьля гадоў цяжкога гістарычнага выпрабаваньня засьвітае зара вызваленьня, прыйдуць гады славы й трыумфу. Будуць мінаць дзесяцігодзьдзі й стагодзьдзі, будуць паяўляцца новыя волаты духа й майстры мастацкага слова. Не адзін зь іх сваім талентам і ўмельствам патрапіць зацьміць і Купалу. Але выключная роля й значэньне Купалы, як у беларускай літаратуры, гэтак і ў нацыянальным жыцьці народу, астанецца заўсёды непрамінаючай, творчай і запладняючай. Купала стаўся ўжо сяньня сымбалем духовае сілы й нацыянальнага вызваленьня беларускага народу і гэтакім ён астанецца для будучых пакаленьняў».

М. Б.

Янка Купала ў БССР

Калектыў навуковых супрацоўнікаў музэю Янкі Купалы займаецца даследніцтвам творчасьці й жыцьця Купалы. Сёлета выйшла з друку першая частка бібліяграфіі твораў Я. Купалы (1905—1917 гады), складзеная Ул. Луцэвіч і Н. Кудраўцавай. У друку знаходзіцца «Зборнік дакладаў, артыкулаў і матар'ялаў аб жыцьці й творчасьці Я. Купалы» (абыймо 30 друкаваных аркушаў). Шмат ужо зроблена над выяўленьнем і сыстэматызацыяй матар'ялаў для другое часткі бібліяграфіі, што ахоплівае творы паэты ад 1917 да 1942 году.

У музэі закончана асноўная праца над тэмай «Карта падарожжаў Я. Купалы і ягоны ўдзел у літаратурна-грамадзкім жыцьці краю». На гэтай карце можна будзе прасачыць удзел паэты ў юбілейных датах, зьвязаных з грамадзкім і літаратурным жыцьцём краю, ягоныя падарожжы на новабудоўлі, на прадпрыемствы і ў калгасы.

Творы Я. Купалы выдадзены на 66 мовах Савецкага Саюзу, а таксама на мовах краёў «народнае дэмакратыі».

Імём Я. Купалы названа ў Беларусі 15 калгасаў, 5 бібліятэк, 2 тэатры, 2 школы, вуліцы ў Менску і іншых местах.

(Паводля «Сов. Белорусии» з 29. 5. 55).

Статыстычныя бурбалкі

Газэта «Чырвоная Зьмена», што зьяўляецца «органам ЦК ЛКСМ Беларусі», у сваім нумары з 1. 6. 55 г. у артыкуле п. заг. «Рыхтавацца да абмену камсамольскіх дакумэнтаў» падае цікавыя і нядвузначныя весткі аб камсамоле на Беларусі. Ніжэй падаём колькі выпісак з успомненага артыкулу «Чырвонае Зьмены»:

«Толькі безадказнымі адносінамі да ўліку збоку сакратароў асобных райкомаў і загадчыкаў сэктараў уліку і статыстыкі можна растлумачыць той факт, што **зь менскай абласной камсамольскай арганізацыі больш за 8 тысяч камсамольцаў выбыла бязь зьняцьця з уліку.** (падкр. у цыт. нашыя — Перап.) Асабліва шмат такіх выпадкаў у Нясьвіскай, Барысаўскай, Рудзенскай раённых камсамольскіх арганізацыях.

«Віцебскі раённы камітэт ЛКСМ Беларусі доўгі час падаваў у сваіх справазданьнях, што бязь зьняцьця з уліку з раёну выбыла толькі 83 сябры ВЛКСМ. Праверкай-жа абкому ўстаноўлена, што такіх камсамольцаў 613. Журавіцкі райком камсамолу падаваў, што з раёну выбыла бязь зьняцьця з уліку 47 сяброў ВЛКСМ, а ў запраўднасьці — 271».

Фэхтаваньне

Фэхтаваньне — малады від спорту на Беларусі. Ён пачаў разьвівацца прыкладна з 1946 году. За гэтыя гады вырасла шмат пляядаздольных беларускіх фэхтавальшчыкаў. 8 зь іх сталі майстрамі спорту. Беларусь, якая ніколі ня мела фэхтавальшчыкаў, цяпер сталася аднэй з мацнейшых рэспублік у гэтым відзе спорту. Першы буйны посьпех прынесла жаночая каманда. У 1947 годзе мянчанкі В. Булачка, Л. Баўдырава і В. Яфімава заваявалі камандное пяршынство краіны сярод жаночых каманд. Такую-ж перамогу атрымала беларуская мужчынская каманда рапірыстых, але... праз сем год пасьля жанчын. На пяршынстве краіны 1954 году беларуская каманда ў складзе Г. Бокуна, А. Аўсянкіна, А. Разжывіна і 20-гадовага Паўла Зэлікмана сталася чэмпіёнам СССР. Ува ўсіх відах зброі каманда БССР заняла ў вапошнім пяршынстве Савецкага Саюзу чацьвертае месца.

(Паводля газэты **«Чырвоная Зьмена»** з 10. 5. 55 г.).

Савецкія герархі едуць у Лёндан

«Дэйлі Тэлеграф» за 25 чэрвеня сёлета падае да ведама, што група 8 чалавек савецкіх царкоўных дастойнікаў прыедзе 4 ліпеня сёлета ў Лёндан. Цікавым ёсьць тое, што на чале ўсей групы ёсьць названы Менскі Мітрапаліт Піцірым: «the Mitropolitan Pitirim of Minsk auf Byelorussia».

Значыцца, Беларуская Праваслаўная Савецкая Царква, відаць, абстаўленая камуністымі моцна, калі яе «дастойніку» даверылі рэпрэзэнтаваць навонкі «расейскія цэрквы». Мітрапаліт Піцірым быў назначаны ў Менск у 1947 годзе.

13 ліпеня ўся група савецкіх герархаў будзе прынятая сябрамі брытанскага парляманту. Разам з праваслаўнымі герархамі прыедуць і архіяпіскапы эвангеліцкіх лютаранскіх цэркваў Латвіі й Эстоніі.

У СПРАВЕ МЕСЯЦА БЕЛАРУСКАЕ КНІЖКІ

На працягу мінулых гадоў Выдавецтва «Бацькаўшчыны» абвяшчала месяц ліпень — Месяцам Беларускае Кніжкі, падчас якога прадстаўнікі, супрацоўнікі й сымпатыкі Выдавецтва зьбіралі на падпісныя лісты сярод беларускага грамадзянства на эміграцыі складкі на папаўненьне выдавецкага фонду Выдавецтва з мэтаю павялічэньня выпуску ў сьвет цэнных і карысных беларускіх кніжак. Такі-ж самы збор складак на выдавецкі фонд Выдавецтва «Бацькаўшчыны» будзе праведзены і ў сёлетнім годзе, толькі ня ў ліпені, бо, як паказала практыка, месяц гэты з гледзішча на летнюю пару для гэтае акцыі нявыгодны, але ў верасьні або кастрычніку.

Выдавецтва «Бацькаўшчыны»

Г. А. Такаеў

Аб Бэрыі, Керэнскім, рэвалюцыі й контррэвалюцыі

(Працяг з папярэдніх нумароў)

29. Гэта магчымае толькі пры канцэнтрацыі й цэнтралізацыі

Ведама, што пад канец 30-ых гадоў працэс пераходу ад **абагульніваньня** да **ўдзяржаўліваньня** закончыўся. Мы ўступілі ў новую стадыю так званага «сацыялістычнага будаўніцтва», якую цяпер прынята называць сталінізмам. Прыпамінаецца тэза руцінцаў: між дэкляраванымі мэтамі першага пэрыяду рэвалюцыі і завяршальным удзяржаўліваньнем існуе антысацыялістычная прорва. Гэта пісалася на самым пачатку 30-ых гадоў.

Далей ведама, што прыблізна тады-ж пачалося фізычнае вынішчэньне інакш думаючых, навет тактычных апазыцыянэраў у сярэдзіне ВКП(б). Гэта быў арганічны й нямінучы вынік канцэнтрацыі й цэнтралізацыі. Ён прывёў, і ня мог ня прывесьці, да тэрарызацыі і без таго досыць тэрарыстычных органаў **дзяржаўнай** бясьпечнасьці. Наступілі часы панаваньня дырэктываў і загадаў, прысудаў і абвінавальных актаў. НКВД прыпадобнілася да штыха, які, паводля словаў Бухарына, пачаў нашчупваць мазгі. Ужо ў 1934-35 г. г. дзяржава была падобная на аддзел, загнаны ў міжгор'е, які можна назіраць з вышыняў. Гэта якраз «гад» Мяркулаў сказаў у 1946 годзе, што «мы пачынаем звальвацца на мішэй у шкляной кульцы»: алігархія пачала бачыць бадай што ўсё, што адбывалася ў сярэдзіне гэтай кулькі. Заданьні тэрору непараўнальна вырасьлі, усякае інакшае думаньне пачало кваліфікавацца, як контррэвалюцыя і буржуазны нацыяналізм, дзяржаўнае злачынства й шпіянаж у карысьць сьветнага капіталу.

У такіх умовах, звычайна, увага дыктатараў, алігархіі канцэнтравалася перадусім на НКВД, як на аружжы ўплыву. Машыністы, зацеміўшы непарадкі ў нутраных мэханізмах, дзеіць, фактычна, пры дапамозе адпаведнага інструманту. А НКВД, у сваю чаргу, зласьлівасьць праяўляла на народных масах.

Дзяржынскаму й Мянжынскаму пашчасьціла толькі таму, што яны жылі да завяршэньня канцэнтрацыі й цэнтралізацыі. Ягодзе, Яжову, Фрыноўскаму, Гаю, Паўкэру, Мяркулаву, Кабулаву, Гоглідзэ, Абакумаву, Мешыку, Бэрыі, Руміну і «іжэ зь імі» не пашчасьціла толькі таму, што жылі ў эпоху агульных канцэнтрацыяў і цэнтралізацыяў. Можыце ня сумлявацца, што тая-ж доля чакае Серава й Круглова, бо-ж разьмеры й нутраны ўзрост імпэрыі ўжо дасягнулі такіх паказьнікаў, калі калішняй цэнтралізацыі й канцэнтрацыі не дастаткова для эфэктыўнага кіраваньня, і калі гайка будзе закручвацца далей. А гэта ня можа не дадаваць КГБ і МВД супэртэрарыстычнага характару. Але генэрал арміі Мяркулаў, адзін із найбольшых чэкістых СССР, быў далёкім ад жартаў, калі сказаў: існуе мяжа паліцыйных магчымасьцяў.

30 Роля і месца КГБ — МВД

Бэрыя й Мяркулаў ведалі аб гэтым і ілюзіяў не рабілі, на довад чаго можна-б было прывесьці шмат канкрэтных ілюстрацыяў. Спрошчана кажучы, яны мелі шмат магчымасьцяў, але не маглі нічога рабіць бескантрольна. Папершае, у Бэрыі было шмат заступнікаў і памачнікоў, якія, звычайна, былі вернымі неаднаму яму, зьяўляліся прыяцелямі не аднаго Бэрыі. Падругое, у Бэрыі й Мяркулава ў сярэдзіне палітбюра-прэзыдыюму былі старыя асабістыя ворагі, і першы сярод іх Молатаў, які займаў даволі моцныя пазыцыі. Патрэйцяе, і гэта асабліва важна, МГБ або МВД, як поўнасьцю дзяржаўныя міністэрствы, ня існавалі і ня існуюць: яны былі, ёсьць і будуць толькі аружжам алігархіі, ім дадзеныя толькі выканальныя правы, іхныя супрацоўнікі зьяўляюцца сябрамі й кандыдатамі партыі, у кажнай іхнай установе і пададдзеле гэныя-ж супрацоўнікі твораць партыйную арганізацыю, што перабывае, як такая, пад абсалютным кантролем ЦК КПСС.

Досыць уважна ўчытацца ў дырэктывы й інструкцыі галоўнага палітычнага ўпраўленьня збройных сілаў, і ў аналягічныя інструкцыі й дырэктывы палітычнага ўпраўленьня МВД — МГБ; досыць прыпомніць характар узаемадачыненьняў, скажам, Серава й Аляксандра Мікалаевіча Паскрабышава; дасыць ведаць арганізацыйную структуру самога ЦК КПСС і, асабліва, упраўленьня кадраў ЦК КПСС, — каб разьвеяліся байкі аб бескантрольнай усемагутнасьці ВЧК — ГПУ — ОГПУ — НКВД — МВД — МГБ — КГБ. І хіба аб гэтам лепш за ўсё ня сьветчаць пэрманэнтныя разгромы іхных кіраўнікоў? Быў час, калі Яжова ўважалі за чалавека вышэй людзкіх сілаў, але й на яго знайшоўся тормаз. Быў час, калі перад Ягодай дрыжэлі ўсе, але й сам Ягода быў расстрэлены. Быў час, калі Бэрыю ўважалі усемагутным, але й ён расстрэлены. Цяпер мы сьхільныя ўважаць Серава за асаблівую птушку, але не сьпяшайцеся з вывадамі: пабачым, чым скончыцца гэты Сераў?

31. У пачатках справы Бэрыі-Мяркулава

У 1938 годзе на сталічным гарызоньце паявіўся, як новы лекар нутраных хваробаў канцэнтрацыі й централізацыі, малады й вельмі энэргічны ахвотнік да анэкдотаў, скалазуб Лаўрэнці Паўлавіч Бэрыя, які да таго часу займаў становішча сябры ЦК ВКП(б), сябры прэзыдыюму вярхоўнага савету СССР і першага сакратара ЦК камуністычнай партыі Грузіі. Сталін, які перастаў верыць найбліжэйшаму акружэньню, даручыў яму расьсьледаваць дзейнасьць крывавага Яжова.

Бэрыя справіўся зь небясьпечным заданьнем шыбка, станоўча, па свойму бліскуча, бяссумлеву мужна. На задзіночаным пленуме ЦК ВКП(б) і КПК ён выступіў із сэнсацыйным дакладам (аб зьмесьце дакладу аўтар гэтых радкоў ведаў у канцы того-ж дня, з вуснаў удзельніка пленуму), у якім абвінавачваў усемагутнага камісара дзяржаўнай бясьпечнасьці першай рангі Яжова ў значна большых і далёкайдучых злачынствах, чымся ў 1953 годзе абвінавацілі яго самога: у ператварэньні НКВД у гняздо для антысавецкай ігры замежных разьведак; у зьнішчэньні цьвету кіраўнічых кадраў партыі і дзяржавы; у антыканстытуцыйных дзеяньнях, якія адбываліся ў масавым нарушэньні правоў грамадзян СССР; у насаджэньні агульнага страху, агульнай няпэўнасьці.

Даклад зрабіў незабыўнае ўражаньне. Шмат удзельнікаў пленуму разгубілася, не магла паверыць сваім вушам. Але гэта быў факт. Неспадзявана Бэрыя зьявіўся перад кіраўнічым слоем імпэрыі якімсь надчалавекам, чуць ня міністрам-збаўцаю і міністрам-вызвольнікам. Ягонымі рукамі былі напісаныя пастановы партыі й ураду аб выключэньні Яжова з усіх пасадаў, — ён займаў становішча правадыраНКВД, сакратара ЦК ВКП(б), сябры аргбюра, сябры палітбюра, сябры сакратарыяту, сябры прэзыдыюму вярхоўнага савету і дэпутата вярхоўнага савету.

Я ўжо гаварыў, што аб дакладзе я даведаўся ў той самы дзень. Мне і маім прыяцелям сталася ведама таксама і аб тым, што, ня гледзячы на заметную палёгку ў бальшыні пленуму, ня гледзячы на падтрыманьне Сталіна і некалькіх іншых дыктатараў, Бэрыя сказаў на другі дзень у неафіцыйным коле: **гэта — пачатак майго канца.** Узапраўды, якраз гэты даклад і стаўся фактычным пачаткам ягонай і Мяркулава справы. Яго зьненавідзеў ня толькі Яжоў, — у вапошняга было шмат высокапастаўленых прыхільнікаў, — але й Жданаў, тады яшчэ нязначны дыктатар; Вышынскі, Молатаў, Маленкаў. Затое А. С. Шчарбакоў стаўся цьвёрдым прабэрыяўцам. А ўжо аб падтрыманьні з боку Сталіна, Калініна, Варашылава, Хрушчова й Кагановіча гаварыць ня прыходзіцца.

32. Разгром яжоўшчыны й яго вынікі

Хутка пасьля гэтага Бэрыя быў назначаны народным камісарам нутраных справаў, а Мяркулаў — ягоным заступнікам. Іхным першым актам быў арышт Яжова і групы бліжэйшых ягоных заступнікаў (мова йдзе аб першым арышце пасьля якога, на кароткі час, «Мікола Крывавы» быў назначаны другарадным народным камісарам), разгром усяго апарату яжоўшчыны, звальненьне рэспубліканскіх і абласных яжоўцаў, аддача іх пад суд вайсковага трыбуналу за ўспомненыя абвінавачаньні. Чытач, мабыць, добра памятае тыя захады, а таму няма патрэбы спыняцца на іх дакладна.

Больш ніхто ня мог гаварыць аўтарытэтна пра тое, што наступіла затым, як В. М. Мяркулаў і палкоўнік Гардынашвілі, адзін з блізкіх да Бэрыі людзей. Некалькі іхных паведамленьняў падана ў кнізе аўтара гэтых радкоў, якая прыгатаўляецца да друку. Стварылася досыць камічная сытуацыя: быццам Бэрыя й Мяркулаў здабылі бліскучую перамогу; быццам яжоўцы разгромленыя; быццам Сталін і кампанія цалком на баку «міністра-вызвольніка». Але гэта так толькі здавалася. У запраўднасьці, кажучы славамі Гардынашвілі, **запрацавала якаясь нябачаная сіла.**

Імя гэтай сіле — дзяржаўна- манапалістычная канцэнтрацыя і цэнтралізацыя. Бэрыя размахнуўся занадта. Машына тэрору выявілася складанейшаю ад апарату НКВД. Шчырых яжоўцаў ён адсунуў і аддае пад суд, але «няшчыры» інсцэніравальнік тэрору,**сам тэрарыстычны рэжым,** астаўся ў поўнай цэласьці. Бэрыя біў па гармаце, але не па собсьніку гарматы. Бэрыя падрэзаў іголкі, але не зачапіў карэньняў. Падрэзаў іголку і пераходзіў да чарговых справаў, — яны адрасталі ўзноў.

Апрача гэтага, разумеецца, ня ўсе яжоўцы былі арыштаваныя. Трэба мець

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Сэнатар Васіль Рагуля ня жыве

16 чырвеня 1955 г. пасьля цяжкой хваробы памёр у Новым Ёрку ведамы беларускі настаўнік, пасол і сэнатар Васіль Рагуля.

Святой памяці Васіль Рагуля нарадзіўся 16 ліпеня 1879 г. у вёсцы Ачукевічы Любчанскае воласьці Наваградзкага павету ў сялянскай сям'і. Па заканчэньні пачатнай школы ў сваёй вёсцы ён вучыўся й закончыў настаўніцкую сэмінарыю ў Маладэчне, а пазьней паступіў у Настаўніцкі Інстытут у Вільні, які закончыў у 1906 г. Ад 1898 г. да першае сьветнае вайны працаваў некалькі год у пачатнай школе, а потым — у вышэйшай 4-кл. пачатнай школе.

Будучы настаўнікам, ён быў у цеснай сувязі з сваімі аднасяльчанамі і займаўся палітычнай і культурна-грамадзкай працай і, як надзвычай здольны й энэргічны, належыў да ўплывовага актыву ў Любчанскай воласьці.

У 1914 г. В. Рагуля быў змабілізаваны ў расейскую армію, дзе, як вайсковы чыноўнік, прабыў да 1918 г. Пасьля вайны ён прыехаў зь сямьёю ў Ачукевічы й пачаў наладжваць разбураную вайною гаспадарку, каб перажыць галодны пасьляваенны час. Неўзабаве прыйшлі бальшавікі, якія змабілізавалі яго ў бальшавіцкую армію. Хуткае замірэньне бальшавікоў з Палякамі спрыяла й хуткаму яго павароту ў Ачукевічы, але тут яго спаткала страшнае гора — у яго адсутнасьці трагічна памерла жонка й пакінула двое малых сіротаў. Пачалося цяжкое жыцьцё на гаспадарцы, без гаспадыні ў хаце й ніякіх матарыяльных сяродкаў, з малымі дзяцьмі...

Надыйшоў час выбараў у першы польскі парлямант. У восені 1922 г. адбылася ў мястэчку Негневічах канфэрэнцыя прадстаўнікоў 4-х воласьцяў: Негневіцкай, Шчарсоўскай, Любчанскай і Гарадзішчанскай. На гэтую канфэрэнцыю быў запрошаны й С. П. В. Рагуля, якога аднагалосна выбралі дэлегатам на канфэрэнцыю ў Баранавічы, а таксама кандыдатам у сойм ад Наваградзкае акругі. Жахлівае матар'яльнае становішча было паважнаю прычынаю, што змушала яго адмовіцца ад гэтых выбараў, але настойлівыя просьбы ўдзельнікаў канфэрэнцыі й пачуцьцё грамадзкага абавязку змусілі яго пагадзіцца з выстаўленьнем ягонай кандыдатуры. Трэба зазначыць, што Негневіцкая канфэрэнцыя была дэцыдуючым мамэнтам у зьмене палітычнага пагляду й далейшай працы В. Рагулі. Ад гэтага часу ён выплыў на арэну беларускага цэнтру ў Вільні й пачаў браць актыўны ўдзел у барацьбе за палепшаньне дабрабыту беларускага селяніна й незалежнасьць Беларусі. Зь першых дзён перадвыбарчае агітацыі ён абходзіць у лапцях свой Наваградзкі раён і, у выніку гэтае агітацыі, здабывае абсалютнае прызнаньне й пашану беларускага насельніцтва й перавагу над кандыдатамі ў сойм другіх партыяў. Ня гледзячы на тое, што Цэнтральны Беларускі Камітэт у Вільні выставіў яго кандыдатуру на 4-ае месца па Наваградзкім сьпіску, ён выбіраецца паслом у сойм і

Наваградчына заняла першае месца па колькасьці выбраных беларускіх паслоў. Наваградак зь беларускаю гімназіяю становіцца пасьля Вільні другім палітычным і культурным цэнтрам беларускім у Заходняй Беларусі. Сягоньня ўжо нябожчыкі Сьвятой Памяці Васіль Рагуля, адвакат Павал Сьвірыд і апошні дырэктар Беларускае Гімназіі ў Наваградку Янка Цеханоўскі былі неадлучнымі чаловымі дзеячамі ў палітычнай і культурнай працы Наваградчыны. Гэта сапраўды была гвардыя чыну, ахвярнасьці, сумленьня й служэньня на карысьць беларускай справы. С. П. В. Рагуля, як пасол і сябра Беларускага Пасольскага Клюбу ў польскім сойме й сэнаце, браў чынны ўдзел у вабароне беларускіх справаў у сойме, езьдзіў у 1927 г. з адпаведным мэмарыялам да Лігі Нацыяў у Жэнэве й, як лідар партыі Беларускага Сялянскага Саюзу, выдаваў газэту гэтае партыі «Сялянскую Ніву».

У 1928 г. у часе другіх выбараў у польскі парлямант В. Рагуля быў выбраны ў сэнат. Польская пракуратура абвінаваціла ўжо сэнатара В. Рагулю за прадвыбарчую агітацыю й засудзіла яго на 2 гады цяжкае турмы, якую ён адседзеў пасьля сэнатарскай кадэнцыі.

Пэрыяд пасольскае й сэнатарскае кадэнцыі С. П. В. Рагулі адзначаецца надзвычайнай яго актыўнасьцю й ахвярнасьцю зь ягонага боку на карысьць беларускае справы. Ня было ніякае арганізацыі ў Заходняй Беларусі таго часу, якой-бы не дапамог В. Рагуля матар'яльна й маральна. Асабліва адчула такую падтрымку беларуская гімназія ў Наваградку, што была ў той час безь дзяржаўнай дапамогі. Гэтая яго ахвярнасьць адмоўна адбілася на матарыяльным стане яго сям'і, бо пасьля сэнатарскай кадэнцыі й 2-х гадоў турмы, ён вярнуўся ў Ачукевічы бяз жадных грашовых ашчаднасьцяў і змушаны быў прадаць кусок свае зямлі, каб даць вышэйшую асьвету сваім дзецям па заканчэньні імі Беларускае Гімназіі ў Наваградку.

У 1939 г. прыйшлі бальшавікі й В. Рагуля разам зь іншымі быў арыштаваны й вывезены, але вайна Немцаў з бальшавікамі дае яму магчымасьць уцячы і зноў вярнуцца да свае хаты ў Ачукевічы.

У часе нямецкае акупацыі Беларускі Нацыянальны Камітэт у Наваградку вызначыў В. Рагулю на становішча кіраўніка раёну ў Дзятлаве, дзе ён таксама здабыў пашану й любоў з боку беларускага грамадзтва.

Адгэтуль ён перад самым адступленьнем нямецкае арміі выехаў у Нямеччыну, пазьней у Бэльгію, а нарэшце у Новы Ёрк, дзе суджана было яму на руках свайго сына, нявесткі й унукаў аддаць на векі сваю несьмяротную душу Богу.

Няхай будзе Табе, дарагі настаўнік і сябра, няўтомны й бязьмерна ахвярны змагар за волю беларускага народу, лёгкай Амэрыканская зямелька. За свабоду Ты ўсё жыцьцё вёў змаганьне, што зьяўляецца прыкладам для нашага маладога пакаленьня ў канчальнай барацьбе за незалежнасьць нашае Бацькаўшчыны.

Вечная памяць Табе!

Твой малодшы сябра А. Орса.

Беларусы Нью Ёрку разьвіталіся із сьв. пам. В. Рагулям

Дня 16 чэрвеня сёлета адыйшоў ад нас назаўсёды сьв. памяці сэнатар Васіль Рагуля. Вестка аб ягонай сьмерці маланкаю разьбеглася сярод Беларусаў Нью Ёрку і ўсяе Амэрыкі і ўзварухнула сэрца кажнага зь іх, бо ўсе яго ведалі, як нязломнага змагара за беларускую справу й стойкага абароньніка інтарэсаў беларускага сялянтва ў Заходняй Беларусі. Ня толькі Беларусы, але й чужынцы яго ведалі й шанавалі, як выдатнага нацыянальнага дзеяча. Вестку аб ягонай сьмерці зьмясьціла й найбольшая амэрыканская газэта «Нью Ёрк Таймс» за 19 чэрвеня сёлета.

Пахароны адбыліся ў суботу 18 чэрвеня. Сьв. памяці Васіль Рагуля быў пахаваны на Івэргрын могілках у Нью Ёрку. На вечны супакой праводзілі Нябожчыка Ягонае Высокапраасьвяшчэнства Архіяпіскап БАПЦ Васіль, які ў асысьце а. Ф. Данілюка адслужыў паніхіду й малебен па памерлым. Апрача сям'і сьв. пам. В. Рагулі і др. Барыса Рагулі, які прыляцеў з Канады, Нябожчыка праводзілі прадстаўнікі ўсіх беларускіх арганізацыяў Нью Ёрку і бліжэйшых ваколіцаў.

Над магілай Нябожчыка прамаўляў старшыня сэктару Рады БНР у ЗША сп. К. Мерляк, які падчыркнуў нацыянальныя заслугі памерлага й выразіў словы спагады для асірацелай сям'і Рагуляў ад імя Рады БНР і яе Прэзыдэнта інж. М. Абрамчыка. Старшыня галоўнай управы БАЗА сп. М. Тулейка адзначыў заслугі сэнатара. Напасьледак др. Барыс Рагуля ў кароткіх словах разьвітаўся із сваім дзядзькам. Плаўна расплыліся гукі на ньюёрскім магільніку «Сьпі пад курганам гэрояў», пасьля чаго ўсе пакінулі сьвежую магілу, пакрытую вянкамі красак ад беларускіх арганізацыяў і прыяцеляў памерлага.

На супольнай жалобнай вячэры прамаўлялі др. А. Орса, сп. А. Стагановіч і др. М. Шчорс.

К. Мароз

НА ФОНД БЕЛАРУСКАЕ КНІГІ
(Працяг)

Падпісны ліст № 3, зьбіральнік сп. М. Сільвановіч: 1. Мікола Сільвановіч — 3 канадыйскія даляры, 2. Янка Шымчык — 2, 3. В. Есенавец — 2, 4. Мікола Міхновіч — 1, 5. Іван Бурдзь — 1, 6. М. Радчанка — 1, 7. Міхась Радчанка — 1, 8. Ул. Гуцько — 1, 9. А. Шымчык — 1. **Разам 12 даляраў.**

Усім, што далі складку на Фонд Беларускае Кнігі, як і сп. Зьбіральніку складак выражаецца на гэтым месцы шчырая падзяка.

Выдавецтва «Бацькаўшчыны»

ВЫПІСВАЙЦЕ, ЧЫТАЙЦЕ Й ПАШЫРАЙЦЕ БЕЛАРУСКІЯ КНІЖКІ — — ВЫДАВЕЦТВА «БАЦЬКАЎШЧЫНЫ»!

Куток мовы

Аб некаторых словах і хормах нашае мовы

(Працяг, гл. № 26)

Націск

У прыйменьніку «дзіўны» ў значэньню рас. «странный» націск на канчатку: дзіўнога, дзіўному і г. д.

У **наступны** націск на канчатку. Відаць гэта таксама з націску на канчатку у **пераступны** (год).

У **ночны, морскі** націск на «ноч—», «мор—». Гэта сьцьвердзілі ўсё чыста дасьледаваньнікі.

Колькі хормаў

«Бальшыню нашых вазёраў пакінуў нам ледавік». Прыстаўное «в» бывае заўсёды на пачатку складу перад «о» (возера, вольха, сінявокі), таксама заўсёды бывае перад націсьненым «у» на пачатку складу — (вуха, навука). Калі «у» ненацісьненае стаіць на пачатку складу, дык не заўсёды перад ім бывае прыстаўное **в** (вучыць, вучыцель, але побач із «навучыць» ёсьць «наўчыць», «наўчоны». Перад **а** на пачатку складу бывае прыстаўное **в** толькі па прыйменьні **у, ў** (акно, на акне, агонь, на агню, але: у вакне, у вагню). Гэта ёсьць добра вылажана ў маёй граматыцы на бач. 40-42. Але хто ў нас граматыку чытае? А каб чыталі, дык ня трэ' было-б займаць часу й месца гэтым выясьненьнем. Дык мае быць: Бальшыню нашы **азёраў** пакінуў нам ледавік.

«Самы запраўдны» — русыцызм, паблр. найвышшая ступень прыметнікаў ня творыцца пры помачы «самы», але пры помачы часткі «най». Дык мае быць: найзапраўднейшы. Найвышшая ступень прыметнікаў і прыслоўяў творыцца таксама пры помачы прыслоўяў «вельмі, дужа, надта»: хораша, харашэй, найхарашэй; харошы, харошшы, найхарошшы; або найвышшая ступень: вельмі (дужа, надта) хораша, харошы.

«Троіцкі» — хорма расейская, паблр. **Траецкі.** Гэта тая самая асаблівасьць, што маем у «яечня, яец, прыемны, узаемны». У рас. мове ў усіх такіх прыпадках ёсьць «і»: яичница, яиц, гостеприимный, взаимный».

Ёсьць дзеяслоў «тарнавацца» (няскончанага трываньня) і «прытарнавацца», але няма «датарноўвацца».

Беспасярэдні, але не «непасрэдны; **дзеяць,** але ня «дзейнічаць».

Той спакмень (прадмет), што не вялікі й не малы, але ўвелькі паміж вялікім і малым, завецца **сярэдні.** Таксама тое, што праходзе пасярэдзіне чагось, будзе сярэднім. Прыкл., калі на лісьце паперы правядзём колькі рысаў і адна зь іх будзе праходзіць пасярэдзіне ліста, тая будзе сярэдняя. Калі да «сярэдні» дадамо прыймя «па», дык мусіць быць **пасярэдні.** Калі, прыкладам, Пётра кажа што Адолю, а гэты перадаець пачутае Палікарпу, дык пасярэднім, пасярэднікам паміж Пётрам і Палікарпам ёсьць Адоль. Пётра мае пасярэдняе дачыненьне да Палікарпа. Калі-ж Пётра прыходзе сам да Палікарпа, дык ён абходзіцца без пасярэдніка, гутара з Палікарпам **беспасярэдне,** у іх дачыненьне **беспасярэдняе.** Але «непасрэдны» ніяк нельга вывесьці ад «сярэдні». «Непасрэдны» зроблена моўнымі анальфабэтамі з рас. «непосредственный» і належа да жахлівага савецкага расейска-беларускага жаргону.

Влр. **дзеяць** адказуе рас. «действовать» пол. «чыніць» і «дзялаць». Прывяду прыклады із слоўнікаў Насовічавага, Гарэцкага, Шатэрнікавага й Касьпяровічавага: што яны там дзеюць? Ліха дзее ён **Дзеяцца, зьдзеяцца** — происходить, произойти. Прыводжу прыклады з тых-жа слоўнікаў: Глянь, што там дзе-

(Заканчэньне на 4-ай бачыне)

наўвеце, што да мамэнту назначэньня кіраўніком НКВД Яжоў быў сакратаром ЦК ВКП(б) ў справе кадраў: скрозь на кіраўнічых становішчах перабывалі ягоныя стаўленікі. Яны ня любілі Бэрыі. А яшчэ менш маглі любіць яго якімсьці чынам уцалелыя стаўленікі Яжова ў самым НКВД.

Вось чаму нязвычайна цікава прывесьці наступныя словы Мяркулава (цяпер гэта ня можа яму пашкодзіць): «...Гэтага трэба было баяцца з самага пачатку, паколькі ня ўсе пакрыўджаныя ў 1939-40 гадох чэкістыя былі зьнішчаныя, паколькі часьць зь іх асталася ў вабноўленым апараце, паколькі шмат зь іх падчас вайны высунулася і ўзноў апынулася на важных становішчах, паколькі ненавісьць чэкістага зьнікае толькі зь яго сьмерцю».

33. «Мой зор і пагляд — табе, Лаўрэнці!»

Першы раз з Бэрыяй вока-на-вока я сустрэўся пару тыдняў перад назначэньнем яго кіраўніком НКВД. Нас было каля 12 асоб. Мы былі зьдзіўленыя й зьбянтэжаныя ягоным тонам. Ужо тады ён гаварыў аб Яжову, Вышынскім і іншых надзвычайна разьвязьліва. Яжова, афіцыйна яшчэ не адсунутага, ён называў ня інакш, як «крывавым Міколаю», барбарам, людаедам, крывапіўцам, тэрарыстым, выскачкай, правакатаром і пры гэтым абяцаў выпаліць распаленым зялезам яжоўшчыну.

І трэба заявіць з належнаю яснасьцю, што ім было зроблена шмат. Зь ягонай ініцыятывы і дамаганьня трохі пазьней была выдадзена нідзе не апублікаваная палітычная амнэстыя, у сілу якой сотні тысяч былі звольненыя, а для перагляду нязвольненых былі назначаныя спэцыяльныя «тройкі». Мне асабіста ведамы выпадак скасаваньня сьмяротнага прыгавору над групай «буржуазных нацыяналістых» за некалькі гадзінаў да выкананьня гэтага прыгавору. Дакумэнтальна ведама, што гэта было зроблена самапраўным, ні зь кім няўзгодненым, тэлеграфічным загадам Бэрыі. Мабыць, такіх выпадкаў было шмат.

Больш таго, Бэрыя дамогся выданьня спэцыяльнай пастановы народных камісараў аб звароце звольненым сканфіскаванай маемасьці або аб выплаце ім адпаведнай аднаразовай грашовай дапамогі, аб рэгабілітацыі тых, на якіх былі беспадстаўна зробленыя даносы, аб павароце іх на папярэднія становішчы, аб вынясеньні афіцыйных прабачэньняў найбольш выдатным ахвярам тэрору і г. д.

Выконваліся ці ня выконваліся гэтыя пастановы скрозь і заўсёды, — я ня ведаю, і ня гэта ёсьць сутнасьцю гэтага майго выкладу. Я хачу падчыркнуць толькі адно: у рэкордна кароткі час рэпутацыя Бэрыі дасягнула арлінага ўзьлёту. На ягоны адрыс сыпаліся ўдзячныя тэлеграмы і лісты. Пантофель-Нечэцкая навет запяяла: «Мой зор і пагляд — табе, Лаўрэнці!»

34. Молатаў зьненавідзеў Бэрыю за гэтую папулярнасьць

Магчыма, што ўсё гэта было чарговай памылкай народаў СССР, чарговай праявай палітыкі перніка Крэмля. Магчыма, што Бэрыя толькі выконваў волю Сталіна. Магчыма, што гэтае самае рабіў-бы на ягоным месцы кажны іншы. Я асабіста ня сумляваюся, што новы кіраўнік НКВД ніколі ня быў асаблівым гуманістым, — аб гэтым, між іншым, досыць добра сьветчыла ягоная папярэдняя дзейнасьць на Каўказе, і кіраваўся ён зусім не пачуцьцямі спачуваньня да ахвяраў яжоўшчыны. Звальняць трэба было ня сотні тысяч, а мільёны. Апрача гэтага, Бэрыя — ня хлопчык, каб не разумець розьніцы паміж іголкамі і карэньнямі. Напасьледак, ён ня мог забывацца, што рэжым, сябрам якога ён быў сам, ўжо ўсьпеў зьнішчыць мільёны, што ніякая сіла больш не дапаможа гэтым ахвярам.

Усё магчыма. Але факт астаецца фактам: Бэрыя апынуўся ў такой ролі і ў такі час, што ягоная папулярнасьць расла таксама шыбка, як шыбка падала папулярнасьць і наагул палітычная рэпутацыя Молатава, старшыні ўраду. У 1944 годзе Гардынашвілі гаварыў мне, што на гэта зьвярнуў увагу сам Бэрыя, які ў форме жарту зацеміў: **Молатаў зьненавідзеў мяне за гэтую папулярнасьць.**

У 1946 г., гаворачы аб справах у апараце ЦК ВКП(б), адзін супрацоўнік апошняга сказаў мне, што вайну мы выгралі, але прайгралі адзінства палітбюра, што Бэрыя ненавідзіць Жданава й Молатава на столькі-ж няпрымірна, на сколькі яны ставіліся да яго з прыдзірствам, што адзіным балянсірам зьяўляецца пакуль што **аўтарытэт** хворага Сталіна, што пасьля Сталіна раўнавага зьменіцца шыбкімі падзеямі, што Бэрыя згрубіяніўся і часта вытыкае Молатаву ягоныя капітуляцыйныя настроі ў дні маскоўскай панікі, і што Молатаў пускаў адно астрыё за другім супраць Бэрыі, бодай што адкрыта абвінавачваў яго ў нацыяналістычных настроях.

Тады мы ня прыдавалі асаблівага значаньня гэтым размовам. Усё гэта паказваецца новым і цікавым за мяжой, але не для нас: бо-ж на вярхох КПСС ніколі ня было даўжэйшага адзінства і мы гэта пакажам далей. Але цяпер гэтыя дробязі праліваюць сьвятло на вялікія справы.

35. Сутнасьць канфлікту Молатава з Бэрыям

Бэрыя, ап'янеўшы ад рэкорднага ўзьлёту папулярнасьці, і ўзапраўды ўяўляў сябе міністрам-вызвольнікам, задумаў выкарыстаць сытуацыю для сваіх утылітарна-палітычных мэтаў, забыўшыся, што ўцалелыя яжоўцы рана ці позна будуць зводзіць зь ім парахункі, меў неасьцярожнасьць падняць руку і на самога Молатава. Ягоныя меркаваньні былі лёгічнымі, але для савецкіх умоваў надзвычайна правінцыйнымі: калі Яжова ўсе прызнаюць праступнікам, дык такім, або амаль такім, трэба прызнаць і Молатава, таму што ён быў беспасярэднім урадавым начальнікам, які падпісваў адпаведныя пастановы, які выдаваў юрыдычныя загады і распараджэньні. Сталін? Пасьля зьняважлівай думкі Бэрыі, ён ня быў **юрыдычнай** асобай, ён быў «толькі» генэральным сакратаром...

Але Сталін паказаўся досыць непадатлівым. Ён узяў Молатава пад ахарону. З дакумэнтамі ў руках Бэрыя гаварыў: «Трэба Вячаслава Іванавіча ведаць», — Сталін маўчаў або адчэпліваўся жартамі; Бэрыя й Мяркулаў гаварылі, што такія й такія праступныя дырэктывы былі дадзеныя Яжову Молатавам, Сталін маўчаў або адкараскваўся жартамі.

Так прадаўжалася больш ці менш доўга. Толькі ў 1941 годзе, пад матывам неабходнасьці лепшага прыгатаваньня да ваеннай сытуацыі, Молатаў быў звольнены із становішча старшыні ўраду. З таго часу ён болей ніколі не падняўся да папярэдняе ўзроўні і ў гэтым не малую ролю адыйграў Бэрыя. З таго часу Молатаў і Бэрыя адзін аднаго ненавідзелі ўсей сваей душой, хаця, разумеецца, намагаліся весьці сябе карэктна, не давалі эмоцыям выходзіць навонкі, бо-ж ведалі, што пры неасьцярожнасьці могуць быць выкінутымі абодвы. Гэтым і аб'ясьняецца той факт, што пасьля сьмерці Сталіна, пасьля зьнікненьня таго, хто мірыў, іхны зудар прыняў вырашальныя формы, — пра гэта мова будзе ніжэй.

36. Сутнасьць канфлікту між Бэрыям і Вышынскім

Вось-жа яжоўшчына засуджана й разгромлена. Але яе арганізавалі й праводзілі Яжоў, Вышынскі і Маленкаў: першы — як кіраўнік НКВД, другі — як пракурор СССР, трэйці — як кіраўнік аддзелу кадраў ЦК КПСС. Яны тварылі гэтак званае «малое палітбюро».

На Вышынскага падала асабліва цяжкая адказнасьць. Ніколі й ніякі ўрад без папярэдніх юрыдычных кансультацыяў ня прыймаў ніякіх пастановаў. На Захадзе часта гавораць і пішуць, што ў СССР расстрэльваюць бязь ніякага суду, — гэта, звычайна, дробязі, пераўвялічваньні. Праўда палягае на тым, што дзеюць **савецкія** законы, і на тым, што паводля савецкіх законаў абвінавачаны не абавязкава, не ўва ўсіх выпадках інфармуецца аб характары абвінавачваньняў, навет аб прысудзе. Наагул-жа, тэарэтычна кажучы, кажны расстрэл мае той ці іншы юрыдычны прысуд, які вынесены судом або «тройкаю», або ў чарзе аднаасабовай пастановы тых або іншых чэкістых.

Выходзіць, калі сотні тысяч расстрэлаў вызнаныя былі памылковымі, калі сотні тысяч былі звольненыя, калі справы іншых сотняў тысяч былі перададзеныя на перагляд, калі яжоўшчына была абвешчаная злачынствам, дык гэта абазначае, што дзейнасьць галоўнага юрыстага СССР, пракурора Саюзу ССР, была прызнаная нездавальняючай, памылкавай, злачыннай, антыканстытуцыйнай. Гэта — ня прыпадковае думаньне: яно было высказанае ясна, выразна й адназначна на пленуме самым Бэрыям. Больш таго, ён дамагаўся Вышынскага аддаць пад суд. Беспасярэдняю прычынаю гэтых дамаганьняў быццам было выяўленьне дакумэнтаў аб неабгрунтаванасьці некаторых абвінавачаньняў супраць групы Тугачэўскага.

Вынік добра ведамы: Сталін не дазволіў расправіцца з чалавекам, які для яго так шмат зрабіў. Але кампрамітуючых матарыялаў таксама было вельмі шмат, таму часткава прыйшлося ўступіць: Вышынскі быў «звольнены» із становішча пракурора і назначаны на адносна другарадную пасаду радавога заступніка старшыні савету камісараў. Гэта было больш для адводу вачэй чужынцаў. Але адно незапярэчнае: з тых часоў Вышынскі быў ізаляваны ад якога-б там ня было ўплыву на нутраную палітыку. Яму даў прытулак ягоны сталы прыяцель Молатаў у галіне вонкавай палітыкі.

З тых часоў дачыненьні між Бэрыям і Вышынскім, вонкава, асталіся карэктнымі, вызначаліся ненавісьцю, гатоўнасьцю падставіць адзін другому нагу пры першай лепшай нагодзе.

Вось-жа калі-б пасьля сьмерці Сталіна Бэрыя не спазьніўся, прыпусьцім, на адзін месяц, дык як «гады» і «агенты» светнага капіталу былі-б расстрэленыя Молатаў і Вышынскі, а ня Бэрыя і Мяркулаў.

(Далей будзе)

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Балонкі мінулага

Ужо колькі разоў я зьвяртаўся да нашага чытача з тымі «навінамі», якія мне іншы час трапяць у рукі зь гістарычнае спадчыны, што датычыцца беларускае тэматыкі. Гэтае адшукваньне — мая слабая струнка, цешыць ды радуе, асабліва калі бачыцца зусім выпадкова ды нечакана.

Пачну ў парадку храналёгіі. Першыя два факты зьвязаныя з выдатнымі пісьменьнікамі: расейскім — **Пушкінам** і украінскім — **Гогалем.** У празаічных творах Пушкіна адным зь ведамых і папулярных зьяўляецца «Дуброўскі», яскрава рамантычнага характару. Ці шмат хто ведае, што сюжэт «Дуброўскага» ў сваім карэньні мае зусім праўдзівае здарэньне, якое адбылося на Беларусі з адным беларускім шляхцічам па прозьвішчу Астроўскі? На самай справе гэта факт. Пісьменьнік Верасаеў у кнізе «Спадарожнікі Пушкіна» сьцьвярджае, што тэма «Дуброўскага» была расказаная Пушкіну ягоным блізкім прыяцелем Нашчокінам (у 30-х гадох мінулага стагодзьдзя), які вывез яе зь беларускіх колаў. Пушкін ператварыў Астроўскага ў Дуброўскага, замест беларускіх мясцовасьцяў паставіў зорачкі, разьвіў у мастацкае апавяданьне, але беларускі выток твору захаваўся.

Другі выпадак з жыцьця і знаёмства Пушкіна і Гогаля прыводзіць пісьменьнік Мардоўцаў у сваім рамане «Зялезам і крывёю». Аднойчы ў гутарцы, калі штосьці расказваў Пушкін, Гогаль едка ўсьміхнуўся і перабіў:

— Гэтак абрабіў, як той Ліцьвін Маскаля!

— Які Ліцьвін? — зьдзівіўся Пушкін.

— Ды, Ліцьвін расказваў, як ён абдурыў Маскаля: пабіліся яны: «Ён, кажа Ліцьвін, мяне абухом, а я яго лапцём, лапцём! Дык што-б вы думалі? Мяне павезьлі, як пана, а ён пабег, як сабака».

Дружны рогат быў адказам на камічны расказ юнага «хахла».

Пойдзем далей. Ці ведае хто, калі быў зроблены першы рэфэрат навуковага парадку аб Беларусі і дзе? Аказваецца, выпадак такі адбыўся у пачатку 60-х гадоў мінулага стагодзьдзя ў Пецярбурзе, у месцы, якое зусім цяжка уяўляецца, пайменна ў Смольным Інстытуце дзеля дабрародных расейскіх дзяўчатаў, самым манархічным і ўпрывелеяваным асяродзьдзі. У кнізе «На золку жыцьця» ведамая пісьменьніца-пэдагагічка Вадавозава — былая Смалянка падае цікавыя рэчы пра навуковую рэформу ў гэтым інстытуце (у пачатку 60-х гадоў), калі туды быў прызначаны новы інспэктар ведамы пэдагог і грамадзкі дзеяч Вушынскі, што грунтоўна аднавіў вучэбна-школьную праграму і зьмяніў старых кансэрватыўных настаўнікаў новымі, прагрэсыўнага кірунку. У ліку такіх аказаўся і вельмі таленавіты пэдагог-географ **Сямёнаў**, по походжаньню зь Віцебшчыны, які скончыў віцебскую гімназію (у 1852 г.), пэўны час быў настаўнікам у Вільні, а потым апынуўся ў Пецярбурзе і запрошаны быў Вушынскім у Смольны інстытут. Адноічы ў старэйшай клясе Інстытуту Сяменаў прачытаў лекцыю ао Беларусі, ао якой, пэўне, ніхто і ня ведаў сярод інстытутак. Ды ня толькі прачытаў лекцыю, але і у пяршыню ў практыцы інстытуту прапанаваў зраоіць на гэту тэму клясны рэфэрат. Адна зь інстытутак (прозьвішча яе Вадавозава не падае) узялася за гэтую справу, працавала вельмі ахвотна пад кіраўніцтвам Сяменава, які прынасіў ей рэдкія матар'ялы ў якасьці падручнікаў. Праз нейкі час адбыўся і сам рэфэрат, на каторым прысутнічаў і інспэктар Вушынскі. Для інстытуту і ягоных вучаніцаў усё гэта было такою неспадзеўкаю і такім надзвычайным зьявшчам, што помніцца на ўсё жыцьцё. Вушынскі, ня гледзячы на сваю вялікую практыку, таксама быў вельмі зацікаўлены рэфэратам аб Беларусі, узяў тэкст ад вучаніцы і тутака-ж у клясе чытаў яго, не адрываючыся. Нарыс аб Беларусі, паводля словаў Вушынскага, перавысіў найбольш сьмелыя ягоныя спадзяваньні.

Гэтак выглядае мой трэйці факт.

Чацьверты можа-б ня было сэнсу і прыводзіць тутака, ён, скажуць, шэры, штодзенны, далёкі ад гісторыі і ад літаратуры. Аднак, я маю на гэта свае пагляды, трошкі разьбежныя з абыякавасьцю. У свой час, калі я рабіў спробы вывесьці з народнай беларускай творчасьці тыповыя рысы характару і натуры Беларуса, я падкрэсьліваў, што паводля народнае песеннасьці Беларус выглядае рэдка тою забітаю, няшчаснаю, рабскаю істотаю, якою яго малююць іншы раз (як скажам Некрасаў у вершы «Зялезная дарога»), народная мудрасьць, наадварот надае Беларусу стрункі стан, харобрасьць удаласьць і сьмеласьць: ён на коніку вараным красуецца, на войструю шабельку апіраецца, саколіка трымае ў руках... Колькі часу таму мне патрапіла кніга ўспамінаў генэрала Ігнацьева «50 год у страю». Праглядаў яе зусім далёкі ад думкі пра беларускія лятуценьні, але вось і тутака напаў на апавяданьне генэрала аб ягоным веставым — жаўнеры Паўлюкоўцу. Гэты звычайны селянін-Беларус зь беднай вясковай хаты, з хмарным тварам — быў узяты па мабілізацыі у Гвардзейскі Уланскі полк. Праз кароткі час Паўлюкавец набыў новае аблічча: зь яго выйшаў «ліхі» (удалы) унтэрахвіцэр, лэйбгвардзісты, які шукаў вайсковае славы і запраўды стаўся гэроем у Японскую вайну.

Прыемна чытаць было радкі, дзе адлюстроўваліся рысы характару Паўлюкоўца.

Трэба думаць, што і цяпер на выгнаньні ня згубіліся, ня згасьлі імкненьні да змаганьня за вольнасьць сярод нашых суродзічаў. Рана ці позна, а паўлюкоўцамі прыдзецца быць; толькі змагацца і шукаць славы ўжо трэба не за чужую, а за сваю Радзіму.

М. Куліковіч

Аб некаторых словах і хормах нашае мовы

(Заканчэньне з 3-яй бачыны)

яцца. Ну, што дзеяцца на сьвеце? Што там дзеяцца, зьдзеялася, няхай Бог баронс. Якое ліха з табою зьдзеялася?

Дзеяньне адказуе рас. действие, пол. дзяланє. Маем і арытмэтычныя дзеяньні.

Дзейнік знача тое, што рас. фактор, пол. чыннік. У граматыцы «дзейнік» адказуе пол. подмёт, рас. подлежащее.

Паміж «дзеяць» і «дзейнік» такое дачыненьне, як паміж «прасіць» і «прашэньнік», «насіць» і «нашэньнік», «касіць» і «касьбіт», «чытаць» і «чытар», «араць» і «араты, аральбіт» і інш.

Перад першай сьветнай вайною ўжывалі ў нашай мове толькі «дзеяць», а «дзейнічаць» ня зналі. «Дзейнічаць» створана ад «дзейнік» кімсь, хто ня знаў слова «дзеяць» і быў пад уплывам рас. «действовать» (ягонае даўжыні). Як ад «прашэньнік» ня можа быць «прашэньнічаць» замест «прасіць», ад «нашэньнік» ня можа быць «нашэньнічаць» і г. д., так ад «дзейнік» ня можа быць «дзейнічаць». Яно належа да таго-ж дзівоснага расейска-беларускага савецкага жаргону.

Словы й хормы, што дзякуй Богу пачалі ўжо ўжываць.

Добра, што «Бацькаўшчына» пачала ўжываць **бясьпечнасьць** замест украінізму «безпека». «Бясьпечнасьць» (ад «бясьпечны») маем як у цяперашняй народнай, так і ў даўнейшай нашай мове.

Царкоўнаславянскае «благий» знача «добры», але ў мове беларускай яно прыняло адваротнае значэньне «нядобры», «ліхі». Дзеля таго й «благаславіць», «благаслаўлёны» мусілі-б адзержыць ад'емнае значаньне, але ў народным сьвядом'ю было яго пазытыўнае значаньне ды пад рэлігійным уплывам зьвязанае з Богам. Дык першую часьць менаваных словаў пачалі замяняць словам «Бог», паўсталі словы «багаславіць, багаслаўлёны». Сэнс застаўся пазытыўны, але зьмяніўся, бо ня Богу трэба добрага, але добрымі словамі*) жадаем, гукаем (прызываем) дабро на кагось або на штось (на якую справу) або проста завем кагось (і Бога) добрымі, харошымі словамі, услаўляем, узьвялічаем. Дзеля таго хорма «багаславіць» не падыходзе, асабліва ў рэлігійным жыцьцю. Іншая зьмена сталася прапушчэньнем «га» **блаславіць,** дзякуючы таму, што беларускае **г** можа ў некаторых прыпадках адпадаць (пр. «аспадар» побач із гаспадар») і выпадаць.

«Блаславіць» сваёй фанэтычнай хормаю ня выказавала ніякага значаньня. І тут нашыя прашчуры — мы можам із іх гардзіцца! — знайшлі добры выхад, яны замянілі менаванае баўгарскае (бо старацаркоўнаславянскае ёсьць старабаўгарскае) слова сваім беларускім **дабраславіць.** У памятках нашае мовы (і літаратуры) мы знаходзім «Дабраслаў, душэ мая, Госпада!»

Тое, што зрабілі нашыя прашчуры, узнавіў цяпер а. П. Чарняўскі. У «Божым Слове» зь І-га мая сёлета маем: «Калі хочаш запраўды любіць Марыю, каб цябе добраславіла ў жыцьці, насьлядуй Яе цноты. Добраслаўлёныя, каторыя сьцерагуць дарог маіх». У нумары з 3-га мая: «Крыжняцца адылі ня ёсьць толькі бяздушнай цырамоніяй, але добраслаўленьням самога сябе. Дабраславенства Сьвятога Крыжа».

Як бачым, а. Чарняўскі піша до-, відавочна думаючы, што ў гэтым складаным слове будуць два націскі, але, як бачым із «дабрадзей», тут адзін націск і трэба пісаць (і казаць) «дабраславіць» (з «а» па «д»).

У «дабраслаўлёны» — добры націск на -лё-, такі націск маем у прыметніках дзеяпрыметнікавага паходжаньня. Прыклады у «пе́чаны, сушаны, яблык» «пе́чаны» ёсьць дзеяпрыметнік, мы адчуваем тут дзеяньне, што яго сьпяклі, але ў «пячоны, сушоны (яблык і інш.) дзеяньне не адчуваецца, гэта — толькі прыметнік.

Як паведамляе сп. Я. Юхнавец, у Барысаўскім пав. пры сустрэчы, замест «дабрыдзень» кажуць адзін аднаму **«дабраслаў!»**

Добра робе сп. Верасень, што піша **сяродак** («Бацькаўшчына» № 22 (252), гэтак і Насовіч дапісаў у свой слоўнік. А «сродак» — дэмонстрацыйны полёнізм. Калі-ж яго перастануць ужываць?!

Добра робе й пісьменьнік Віцьбіч, ужываючы хорму «Марка» у «Плыве з пад сьвятое гары Нёман». Гэта такая-ж хорма, як «маршалка, Міхалка, Іванка, Юрка, Янка». Гэта хормы здрабнелыя, з тэй розьніцаю ў іх, што ў «Міхалка, Іванка» здрабнеласьць адчуваецца, а ў «Марка, Юрка, Янка, маршалка» здрабнеласьць не адчуваецца, зн. сваім значаньнем яны поўныя ймёны або (як «маршалка») поўныя спакменьнікі нагул.

З добрым націскам у множным ліку ўжыта слова «вораг» — **варагоў** («Божае Слова» зь І-га мая). Праз націск у мн. ліку слова «вораг» гл. маю кніжку «Мова рукапісу «Аль кітаб», б. 49.

Таксама добрая хорма **«на руццэ»** (з двума **цц)** у тым-жа нумары «Божага Слова». Асаблівасьць гэткая: у спакменьнікаў усіх радоў на **-ка, -ко** або **-к** (рука, рака, навука, язык, малако), калі перад «к» няма сугуку; дык у прызначальным (давальным) і ў мясцовым склоне перад «э», -ы «к» пераходзе ў падвойнае (а не адно) **цц:** руццэ, на руццэ, у навуццы, у вапеццы, на языццэ, у малацэ. Асаблівасьць гэтая адцемленая ўсімі дасьледаваньнікамі, а тымчасам ня ўсе яе адзначаюць на пісьме. Але некаторыя адзначаюць. У тым ліку кс. др. П. Татарыновіч у «Зьнічу». Некалі справядлівы судзьдзя возьме пад увагу ужываньне кс. Татарыновічам гэтае рысы нашае мовы пры вызначаньню яму кары за ператвараньне беларускае мовы ў нямецкую шчапляньнем двух або трох словаў у вадно.

Словы, што пажадана ўжываць

Гаранін (націск на -нін) — рас. горец, пол. гураль. Слова выведзенае вось із чаго. У Вялейскім пав. ёсьць сяло «Гаране». Гэты назоў ёсьць множным лікам ад «гаранін», каторае ўзноў паўстала ад «гара» (жыхар гары — гаранін, як жыхар места — мешчанін).

Завалкі (націск на -ва) — рас. мигдаловидные железы, пол. мігдалкі. Пр. Заваліла ў горле.

Жарлівы (націск на -лі-) — рас прожорливый, пол. жарлочы. Слова паходзе ад «жэрці». Ёсьць і польскае слова «жарлівы», але яно паходзе ад «жар» і мае іншае значаньне.

Паравы (націск на -вы, — слова паходзе ад «пара» з націскам на -ра) — рас. своевременный, пол. стосовны (у часе). Прыкл.: Паравы нябожчык, паравое дзяцё, зн. каторае радзілася ў пару, паравая касьба, жніво.

Прыведзеныя тры словы запісаў др. В. Тумаш у Сьпягліцы Вішнеўскае вол. Вялейскага пав. Бяссумлеву яны ўжываюцца шырэй. Ад яго-ж паходзе й ведамка пра сяло Гаране і вывад із іх «гараніна».

Прыкісь (націск на пры-) рас. осложнение (болезни), пол. комплікацыя (хоробы). Часта можна чуць «Хвароба пашла ў прыкісь») (- наступило осложнение), зн. ад аднае хваробы пачалася («прыкінулася») другая. Запісана, між іншага ў Арлянятах Ашмянскага па.

Сутнік (націск на су-) — рас. чемодан, пол. валіза. Запісана ў Чухнах ля Крэва Ашмян. пав. У Арлянятах таго-ж павету я чуваў, што сутнікам звалі кош із вечкам у каторы клалі сыры, зн., узноў такі так звалі судзіну блізкую да «чемодана». Хіба паходзе ад «суць» зн. «сутнік» быў-бы і спачатна судзіною зь вечкам, як таковы кош, «чемодан», у каторы клалі штось сутнае, што трэ было зачыніць. Пр. «суднік» — шахва на судзьдзе.

*) У беларускай і ў часьці іншых славянскіх моваў другая часьць гэтага слова, замест «слов-» (ад «слова»), стала гучэць «слав-» (ад «слава»).

(Далей будзе)

Я. Станкевіч

ЗША, ЗГА, ЗДА ці яшчэ як?

На якія лады нас ня пісалі! Асабліва англа-саксы: «ўайт» і «бэлё», «рутэнья» і «раша», зь ігрыкам і безь яго. Запраўды, пачынаеш пераконвацца ў Жылкавай рацыі: «бацькаўшчына Беларусь наймалодшая нацыя». Аднак калі розьніца ў пісаньні аднаго й таго-ж нацыянальнага назову мае абазначаць нацыянальную маладосьць, дык Амэрыканцы ў нашых вачох аказаліся куды малодшымі, чымся мы ў іхных. Гляньма толькі: Задзіночаныя, Злучаныя, Спалучаныя, Зьяднаныя, Аб'еднаныя (якое багацьце мовы!), Штаты, Гаспадарствы, Дзяржавы, а нядаўна адна навуковая ўстанова і Стэйты сюды прыбавіла (цяпер засталося толькі на Юнайтэд пачакаць). Пасьля гэтага пачынаюцца пэрмутацыі з камбінацыямі: ЗША, ЗГА, ЗДА кажнае зь іх пераплятанае ў сваю чаргу яшчэ й «паўночным» дадаткам. Куды Амэрыканцам да нас з сваім ігрыкам!...

Хоць як практыка давяла, на эміграцыі цяжка ўстабілізоўваць падобныя рэчы, аднак гэты курс «абмалоджваньня» малодшага англа-саксонскага брата трэба было-б нейкім чынам спыніць, каб і самім пры гэтым не дзяціцца ды затрымацца на Задзіночаных Штатах Амэрыкі (ЗША), як гэта ад даўжэйшага часу робіць «Бацькаўшчына».

С. Ясень

Антыбальшавіцкая дэманстрацыя ў Брадфордзе

У нядзелю 19-га чэрвеня сёлета ў ангельскім горадзе Брадфорд, у якім пражывае шмат эмігрантаў з за зялезнае заслоны, адбылася вялікая антыкамуністычная дэманстрацыя. Прынялі ў ёй удзел уцекачы з паняволеных бальшавікамі краінаў: Эстоніі, Латвіі, Летувы, Польшчы, Беларусі, Украіны і ангельская антыкамуністычная арганізацыя «Комон Каўз». Дэманстрацыя распачалася арганізаваным маршам галоўнымі вуліцамі гораду. На чале калёны віднеліся нацыянальныя сьцягі краінаў, падбітых расейскім бальшевізмам. Сярод іх красаваўся й беларускі бел-чырвона-белы сьцяг. На самым перадзе калёны, даўжыня якой была большая за кілямэтр, быў несены сьцяг брытанскі.

Шматлікія плякаты й транспарэнты, якія несьлі дэманстранты, гаварылі аб жудасьцях савецкага тэрору ў акупаваных краінах і выражалі просьбу да вольнага сьвету аб прывярненьні вольнасьці й людзкіх умоваў існаваньня грамадзянам Усходнае Эўропы.

Пасьля паходу вуліцамі гораду, якія былі запоўненыя ангельскімі жыхарамі, зацікаўленымі дэманстрацыяй, дэманстранты сабраліся ў вялікай залі Мэханічнага Інстытуту на мітынг. Мітынг адчыніў старшыня ангельскай арганізацыі «Комон Каўз», пасьля чаго ён папрасіў прысутных ушанаваць хвілінай цішыні памяць усіх тых, што загінулі ў савецкіх канцэнтрацыйных лягерах ад голаду й зьнясіленьня, а таксама і ўсіх іншых ахвяраў савецкага рэжыму.

Далей высказваліся прадстаўнікі паняволеных народаў. Беларускі прадстаўнік у сваім выступленьні сказаў, што «жахлівы расейскі бальшавізм спрычыніў беларускаму народу неаблічальныя шкоды і ахвяры, зьнішчыў мозг нацыі — інтэлігенцыю, закатаваўшы найлепшых і найслаўнейшых сыноў Беларусі: Лёсіка, Некрашэвіча, Ігнатоўскага, Цьвікевіча, Ластоўскага, Тарашкевіча, Чарвякова і тысячы іншых інтэлектуалістых і культурных дзеячоў, а таксама мільёны беларускіх сялянаў і работнікаў, якія ўслалі сваімі касьцямі ледзяныя тундры й непраходныя сібірскія тайгі ды пустыні Казахстану. Рэшта беларускага сялянства была загнаная ў калгасны прыгон, які неабмежаванай эксплятацыяй, прыгнётам і прымусам перавышае навет феадальную паншчыну. Наагул савецкі тэрарыстычны рэжым можна параўняць толькі з рабаўласьніцкім ладам Рымскай імпэрыі». Гэтая прамова беларускага прадстаўніка была сказаная ў ангельскай мове.

Пасьля прамоваў была мітынгам аднагалосна прынятая рэзалюцыя, у якой, між іншым, гаварылася:

«Усе краіны, паняволеныя імпэрыялістычнаю палітыкаю савецкага ўраду, павінны быць вызваленыя.

Усе асобы, дэпартаваныя савецкім урадам і ягонымі агентамі зь іхнага сталага месца жыхарства, павінны быць безадкладна вернутыя назад.

Воля народу павінна вызначыць будучыя формы ўраду кажнае краіны».

Прынятую мітынгам рэзалюцыю падпісалі прадстаўнікі ад Беларусаў, Палякаў, Украінцаў і ад народаў балтыцкіх краінаў, а таксама й ангельскі прадстаўнік ад арганізацыі «Комон Каўз». Рэзалюцыя была высланая на рукі прэм'ера Вялікабрытаніі сэра Ідэна, а копіі яе — міністру замежных справаў Вялікабрытаніі і ўсім сябром брытанскага парляманту ад гораду Брадфорд.

Прысутны

НІВОДНАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ, ТАВАРЫСКАЯ Й СЯМЕЙНАЯ ЎРАЧЫСТАСЬЦЬ НЕ ПАВІННА АДБЫЦЦА БЯЗ ЗБОРУ СЯРОД ПРЫСУТНЫХ АХВЯРАЎ НА ВЫДАВЕЦКІ ФОНД «БАЦЬКАЎШЧЫНЫ».

Пісьмо ў Рэдакцыю

Выказваю свой вялікі жаль з прычыны таго, што сваім артыкулам «Аб памылках там і тут» нарабіў Рэдакцыі толькі клопатаў. Стаўшыся сам ахвяраю дэзінфармацыі, я, не праверыўшы на гэты раз фактаў, тым самым дэзінфармаваў чытачоў «Бацькаўшчыны», за што шчыра іх перапрашаю. Цяпер некалькі слоў аб сутнасьці справы. Асабіста Пічэты я ня знаў і зь ім не спатыкаўся. Воляю лёсу мне давялося здабываць навуку ня ў Менску, але ў іншых гарадох. Аднак я добра ведаў аб заслугах гэтага чалавека перад беларускаю навукаю. У сваім артыкуле я й ня думаў зьмяншаць ягонае ролі і зусім непатрэбна было «Чытачу», быццам у «вабароне» Пічэты, прыводзіць сьпіс ягоных навуковых працаў. Патрэба гэтага ня выцякала з майго артыкулу.

«Гісторыя» аб вызваленьні Пічэты Сталінам вельмі старая. Яшчэ ў Менску гэтая тэма была калісь «гарачай» і перадавалася пад вялікім сакрэтам выкладчыкамі й студэнтамі Унівэрсытэту й Інстытуту Народнае Гаспадаркі. Мне асабіста гэтая «гісторыя» была перададзеная асьпірантам Акадэміі Навук А. М., дацэнтам Інстытуту Народнае Гаспадаркі Ф. С. і выкладчыкам таго-ж Інстытуту Г. У. (поўнасьцю прозьвішчаў не падаю, бо некаторыя зь іх собсьнікаў знайходзяцца «там»). Дык калі гэтыя інфармацыі няправільныя, дык, яшчэ раз паўтараю, я стаўся ахвяраю чужое нясьведамасьці.

Якраз наадварот, у гэтай «гісторыі» Сталін паказаны не як «добры даравальнік», але як несамавіты дэспат. Тут падчыркнена тое, што ў Саветах правая рука ня ведае, што робіць левая. Як кіраўнік дзяржавы, Сталін навет ня ведаў, што ёсьць арыштаваны й высланы адзін з рэктараў унівэрсытэту. Ці магчыма гэта яшчэ дзе-небудзь? Ці магчыма, каб, прыкладам, Адэнаўэр, ня ведаў пра арышт рэктара якогась нямецкага ўнівэрсытэту?

Калі год сьмерці Пічэты з памяці, ня маючы пад рукою «Вопросов Истории», замест 1947, пададзены 1946, дык гэта яшчэ бяда невялікая. Вельмі суровы прысуд «Чытача» ў канцы ягонага артыкулу мяне вельмі зьдзівіў. Як відаць, «Чытач», як было паказана і ў маім артыкуле, сам ня робіць і ня прызнае за другімі памылак, а кажную зь іх разглядае, як злачынства.

З пашанаю

В. Верасень

НАШЫЯ ПРАДСТАЎНІЦТВЫ

АНГЕЛЬШЧЫНА:
Mr. Aleksander Laszuk, 97 Moore Park Rd, London, S. W. 6.

АРГЕНТЫНА:
Asociacion Bielorusa en la Argentina, Calle Coronel Sayos 2877, Valentin Alsina, p-cia Buenos Aires.

АЎСТРАЛІЯ:
Mr. A. Vasilenia 25 Belmont P. de Mount Colah, N. S. W.
Mr. Donat Jackievch, 79 A Hudson Rd, Spotswood-Melbourne, Vict.
Mr. A. Moroz, 109 Morrison Rd, Midland Junction, Western Australia.

БРАЗЫЛІЯ:
C. Cimafiejcyk, Prasa 76, Tiridentes, Curitiba — Parana.

БЭЛЬГІЯ:
Mr. Vasil Sčećka, 19, Place Hoover, Louvain.

ДАНІЯ:
J. Lobejko, c/o H. C. Jensen, Leifsgade 6 III tv., Kobenhavn S.

ЗАДЗІНОЧАНЫЯ ШТАТЫ:
Mr. L. Bielenis, 2042 W. St. Paul Ave, Chicago 47, Illinois.
Mr. B. Danilovich, 112 Somerset St. New Brunswick, N. J.
Mr. Ul. Duniec, 1020 Kenilworth Ave, Cleveland 13, Ohio.

НОВАЯ ЗЭЛЯНДЫЯ:
Mr. Marian Karanieuski, 88 Hercules Drayve, Roxburg — Hydro.

ФРАНЦЫЯ:
Mr. Bonifacy Prytycki, 17, Rue Roger Salengro, Lys les Lannoy (Nord).
Section Bielorussiene de C. F. T. C. 26, Rue de Montholon, Paris 9.

ШВЭЦЫЯ:
Basil Lukaszyk, c/o Hammer Ringvagen N. 123/III, Stockholm.

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011